# “Экаход” паляпшае экалогію

**Школьнае лясніцтва “Экаход” Парэцкай сярэдняй школы стала важным элементам фарміравання ў падлеткаў экалагічнай свядомасці, правільных каштоўнасных арыенціраў. “Экаход” — гэта своеасаблівая мадэль партнёрства паміж школай, Скідзельскім лясгасам і Парэцкім лясніцтвам.**

Школьнае лясніцтва дапамагае выхаваць у дзецях любоў да прыроды роднага краю, фарміруе працоўныя навыкі ў галіне лесаводства і лесаразвядзення, аховы прыроды і рацыянальнага прыродакарыстання, дапамагае падрыхтавацца да свядомага выбару прафесіі. Для таго каб гэтага дасягнуць, трэба выбраць цікавыя і змястоўныя формы работы з дзецьмі. Некаторыя заняткі можна распрацоўваць, абапіраючыся на веды і вопыт спецыялістаў лясгаса. Не трэба баяцца такога цеснага супрацоўніцтва з людзьмі, здавалася б, далёкімі ад педагогікі. Шмат якім атрыманым звонку ідэям можна даць выдатную вучэбную і выхаваўчую агранку.

Зараз мы з маімі вучнямі развіваемся ў некалькіх кірунках: грамадска карысная праца, вывучэнне асноў лесаводства, аховы прыроды, доследная і даследчая праца. Навучэнцы рэгулярна ўдзельнічаюць у семінарах, аглядах-конкурсах школьных лясніцтваў і ўжо які год займаюць 2-е месца ў раёне.

У 2010 годзе на тэрыторыі школы заклалі дэндрарый плошчай 1,2 гектара. Зараз сярод зялёнага цяністага характва можна сустрэць барбарыс звычайны, бабоўнік, ясень звычайны, ядловец казацкі, вярбу пурпуровую, тую заходнюю і мноства іншых яркіх відаў. Калекцыя з году ў год працягвае папаўняцца новымі пародамі. Дэндрарый стаў не толькі месцам адпачынку і прагулак. Тут праводзяцца заняткі аб'яднання па інтарэсах “Юны лесавод”, экскурсіі на ўроках біялогіі і для вучняў пачатковай школы.

Члены школьнага лясніцтва даглядаюць тэрыторыю дэндрарыя: займаюцца яго праполкой, палівам, прымяраюць на сябе ролю азеляніцеляў і ландшафтных дызайнераў, высаджваюць новыя саджанцы. За час работы не раз назірала, як пасталелыя выпускнікі, прыходзячы ў школу, шукалі сярод раслін тыя, што былі высаджаны іх рукамі. Саджанцы ўвесь гэты час раслі разам з імі.

Важна навучыць дзяцей думаць у глабальных маштабах. Выхаванцы школьнага лясніцтва кожны год уносяць уклад у развіццё лясной гаспадаркі не толькі сваёй мясцовасці, але і ўсёй краіны. Яны рэгулярна ўдзельнічаюць у рэспубліканскіх і абласных акцыях “Чысты лес”, “Чысты бераг”, “Тыдзень лесу”, “Вялікая ўборка малой радзімы”, актыўна збіраюць макулатуру. Юныя лесаводы садзяць лес (толькі ў мінулым годзе пасадзілі каля дзесяці гектараў), бяруць пад ахову мурашнікі, нарыхтоўваюць корм для зімовай падкормкі жывёл і птушак, вырабляюць шпакоўні і кармушкі.

Важныя і тэарэтычныя ўрокі. Менавіта з іх трэба пачынаць, ужо ў працэсе робячы асноўны ўпор на практыку. На сваіх занятках, вывучаючы з дзецьмі асновы лесаводства, падрабязна спыняюся на тым, што можа ім спатрэбіцца ў штодзённым жыцці, калі яны выберуць шлях захавання і прымнажэння прыродных багаццяў. Таксама заўсёды разглядаю інфармацыю аб прафесіях лясной гаспадаркі і навучальных установах, дзе можна іх атрымаць. Вучні размаўляюць на гэтую тэму і з ляснічымі падчас экскурсій і практычных заняткаў па пасадцы лесу. Гэта важны прафарыентацыйны момант.



Многія вучні, удзельнічаючы ў рабоце школьнага лясніцтва, праводзяць першыя ў жыцці назіранні і даследаванні. Свае работы юныя лесаводы прадстаўляюць на конкурсах “Квітней, мой лес!”, “Зялёная школа”, “Я пазнаю свет”, “Жыву ў Беларусі і тым ганаруся!” і многіх іншых. І нярэдка становяцца пераможцамі гэтых конкурсаў на раённым і абласным узроўні.

У гэтым годзе таксама плануем удзельнічаць у экалагічных мерапрыемствах і акцыях. Значнае месца ў нашай рабоце зойме даследчая дзейнасць па спосабах выяўлення жука-караеда і барацьбы з ім. Актыўнасць гэтага шкодніка ўзрастае з году ў год, выклікаючы гібель дрэў, і праблема патрабуе вырашэння. Сапраўдны абаронца лесу не можа застацца ў баку ад гэтай тэмы.

**Кацярына ЗВЕРАВА,**
**настаўніца геаграфіі**
**Парэцкай сярэдняй школы**
**Гродзенскага раёна.**